Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 9. Варыянт 5**

# Білет № 9. Практычнае заданне. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

**Заданні склала:**Дземідовіч Святлана Мікалаеўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" ДУА "Уздзенская раённая гімназія"

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні:**

1. Прывядзіце гістарычныя факты, якія адлюстроўваюць уклад беларусаў у справу перамогі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.
2. Якім чынам у нашай рэспубліцы ўшаноўваюць памяць аб Вялікай перамозе і аб героях барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
3. Растлумачце, у чым заключаецца гістарычная пераемнасць гульні "Word of Tanks".
4. Ці з'яўляюцца патрыятычныя пачуцці і любоў да Радзімы адной з прычын гераізму беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны?





Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі












*Крыніца 1. Мемарыяльныя комплексы Беларусі*

*Крыніца 2.*

**Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны**

На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагалася больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, з іх 446 удастоены звання Героя Савецкага Саюза, а чацвёра - П. Я. Галавачоў, І. І. Гусакоўскі, С. Ф. Шутаў, І. І. Якубоўскі - двойчы, 67 - сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў. У барацьбе з ворагам удзельнічалі тысячы настаўнікаў, лекараў, інжынерна-тэхнічных працаўнікоў, навукоўцаў. Каля 400 тыс.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

воінаў-беларусаў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. За гады вайны больш за 400 беларусаў сталі генераламі і адміраламі. Многія нашы землякі прынялі актыўны ўдзел у еўрапейскім руху Супраціўлення. Апынуўшыся ў канцэнтрацыйных лагерах, яны наладжвалі кантакты з удзельнікамі антыфашысцкага руху на волі, арганізоўвалі ўцёкі з месцаў зняволення, прымалі ўдзел у стварэнні баявых цэнтраў, якія вялі актыўную барацьбу супраць нацыстаў. Падпольную арганізацыю ў канцэнтрацыйным лагеры Эбензе (Аўстрыя) узначаліў ураджэнец горада Чавусы Магілёўскай вобласці палкоўнік Л. Я. Маневіч. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны плян паўстаньня. Да падыходу саюзнікаў паўстанцы захапілі і ўтрымлівалі лагер. У гэтым жа лагеры гітлераўцы расстралялі аднаго з актыўных удзельнікаў падпольнай арганізацыі ўраджэнца вёскі Тэхцін Бялыніцкага раёна палкоўніка Д. Ф. Цумарава. Найбольш магутным і арганізаваным быў удзел савецкіх патрыётаў у французскім Супраціве. У кастрычніку 1943 г. у Францыі быў створаны Цэнтральны камітэт былых савецкіх ваеннапалонных. Пад яго кіраўніцтвам вязні, сярод якіх было шмат беларусаў, наносілі гітлераўцам значныя страты. У гэтай краіне дзейнічаў таксама асобны жаночы атрад "Радзіма", арганізаваны былымі беларускімі партызанкамі і падпольшчыцамі, якія праславіў сябе баявымі справамі. Камандзірам яго была абрана мінчанка Н. І. Лісавец, а пасля — Р. З. Сямёнава-Фрыдзон. Абедзвюм было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

*Крыніца 3. Героі вайны*

При обороне Ленинграда в августе 1941 г. уроженец Сенненщины наводчик танкового орудия **Андрей Усов** в одном бою снайперским огнем лично подбил 22 танка противника. Это единственный случай в истории. Тогда же в башню его танка попало более ста вражеских снарядов. А.М. Усов на протяжении Великой Отечественной войны трижды горел в танке и трижды был тяжело ранен. После войны ему было присвоено звание почетного гражданина Ленинграда. Он жил и работал в Толочине на родной Витебщине.



А.М. Усов и З. Г. Колобанов

В том бою командовал танковым экипажем Зиновий Колобанов. В послевоенное время он служил в Беларуси, а после увольнения из армии жил в Минске и работал на автомобильном заводе. Одна из самых престижных наград в современной компьютерной игре «World of Tanks» называется «медалью Колобанова». Ею награждается тот, кто последним из своей команды остается в живых и одерживает победу в бою против пяти и более танков противника.